УДК 821.161.3-3.09(042)

# НАРАТЫЎНАЯ СТРУКТУРА “УСПАМІНАЎ З МІНУЛАГА” А. Э. АДЫНЦА

**Бурдзялёва Ірына Аляксееўна**
дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры
ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

Да мемуараў А. Э. Адынца, напісаных аўтарам на схіле год (“Wspomnienia z przeszłości” 1884 г.), неаднаразова звярталіся гісторыкі літаратуры. Сапраўды, мемуарны твор А.Э. Адынца – найбагацейшая крыніца інфармацыі не толькі па творчасці паэтаў філамацкага кола, літаратурным жыцці Літвы-Беларусі 20-х гадоў XIX стагоддзя. Аўтар дакладна і разам з тым па-мастацку вобразна аднаўляе літаратурны асяродак Вільні тых слаўных часоў, калі “ў кожным доме было па паэце”, малюе постаці некаторых выбітных пісьменнікаў варшаўскага асяроддзя, апісвае ўнікальную сітуацыю, калі ў Дрэздэне пасля паражэння Лістападаўскага паўстання сабраліся многія знаныя літаратары.

Адметнасць мемуарна-біяграфічнай літаратуры тлумачыцца сінтэтычнасцю яе жанравай прыроды, парадаксальным спалучэннем дакументальнасці, нефікцыянальнасці і непазбежнай аўтарскай суб’ектнасці. Скіраванасць мемуарнага твора адначасова на гістарычны факт і мастацкасць яго выяўлення вызначае памежнае месца мемуарыстыкі паміж гістарычным выкладам і белетрыстыкай. З мастацка-эстэтычнага гледзішча мемуарны тэкст А. Э. Адынца ніколі не вывучаўся, хаця ён вылучаецца шырокім культурна-гістарычным абсягам, складанай сюжэтна-кампазіцыйнай структурай, шматсастаўнасцю, поліцытатнасцю, дэманструе апавядальніцкае майстэрства аўтара – вядомага на той час паэта, які меў шматлікія знаёмствы і сваяцкія сувязі са многімі творцамі краю. Увага мемуарыста спыняецца і вылучае буйным планам тую



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ці іншую пісьменніцкую постаць у канкрэтных жыццёвых сітуацыях. Значнае месца ў мемуарах займаюць аповеды пра сяброў-пісьменнікаў: А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, А. Фрэента, А. І. Ходзькаў, А. Янушкевіча, Ю. Корсака, знаёмцаў па Варшаве К. Брадзінскага, Ю. Б. Залескага, С. Гарчынскага, В. Поля ды іншых літаратараў.

Свядомую скіраванасць на суб'ектывізм аўтар падкрэслівае ў прадмове, гаворачы, што прапанаваныя запіскі не "гістарычныя ці літаратурныя даследаванні; не дакладныя біяграфіі некаторых асоб… але выключна мае ўласныя асабістыя ўспаміны з сяброўскіх і прыяцельскіх стасункаў у штодзённым жыцці... а будучы гісторык можа выкарыстаць іх настолькі, наколькі стратэг можа аднавіць агульны ход ваеннай кампаніі з апавяданняў простага жаўнера, які браў у ёй удзел і яе герояў бачыў на свае вочы" [1, с. 11]. Яго студэнцкая маладосць прыпала на часы літаратурнага пералому ад класіцызму да рамантызму, і яго галоўная мэта – перадаць асабістыя ўражанні сведкі і ўдзельніка гэтай літаратурнай барацьбы. Але аднаўляючы ў сваіх успамінах постаці сяброў і знаёмых, прыгадваючы асабістыя стасункі і эпізоды з рэальнага жыцця, А. Э. Адынец стварае яркія характарыстычныя замалёўкі жыцця інтэлігенцыі, творчай эліты Вільні і Віленшчыны.

У мемуарах аўтар абірае сабе ролю рэальнага наратара, які распавядае свае ўспаміны Дыятыме – пад гэтым псеўданімам выступала Ядвіга Лушчэўская (1834–1908), вядомая сваім імправізатарскім талентам паэтка і навелістка. Прыём непасрэднага звароту да імпліцытнай слухачкі, якую ён называе не інакш як "сястра" або "сястрычка", прадстаўніцы іншага літаратурнага пакалення, дазваляе Адынцу злучыць час сваёй маладосці з рэальным часам стварэння мемуарнага тэксту і разам з тым адасобіць сябе як наратара, які набывае незалежнае фізічнае існаванне, ад сябе самога ў якасці аўтабіяграфічнага героя. Пісьменнік выразна адчувае велізарную адлегласць часу, пры якой адбылася змена літаратурнай парадыгмы, светапоглядныя і эстэтычныя зрухі. Таму аўтар дапускае частыя крытычныя выпады і палемічныя выказванні, супастаўляючы прыярытэты сваёй пісьменніцкай маладосці, часу "рамантычнай сувязі сэрцаў і духу" з пазіцыямі актуальнага ў 80-я гады пазітывізму. Функцыя наратара-апавядальніка, які мае на ўвазе найперш канкрэтнага адрасата-слухача, дазваляе аўтару спантаннасць успамінаў, адыход ад храналагічнай лініі, суб'ектыўнасць ацэнак, засяроджанасць на дэталях асабістага жыцця, якія ўзнаўляюць атмасферу часу, магчымасць некалькі разоў вяртацца да аднаго і таго ж эпізоду, па-рознаму яго эмацыянальна асвятляючы. "Бачу, што зноў будзе дыгрэсія! Але прабач, сястрычка, што не магу ад гэтага ўстрымацца; тым больш, што лічу гэта вельмі цікавым для прадмета нашай гаворкі" [1, с. 142]. Аднаўляючы чарговы раз перарваную нарацыю, аўтар адзначае: "Не лічу абавязковым трымацца парад-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ку” [1, с. 233]. Гэтыя нарацыйныя прыёмы абумоўліваюць эсэістычны характар “Успамінаў з мінулага” А. Э. Адынца.

У мемуарах, якія з’яўляюцца мастацкім увасабленнем індывідуальнай памяці, як правіла, дамінуе ўстаноўка на аповед або пераважна пра сябе, або пераважна пра “іншага” ў шырокім сэнсе, маючы на ўвазе асобы, падзеі, гістарычныя з’явы. А.Э. Адынец свабодна маніпулюе гэтымі наратыўнымі ўстаноўкамі. На пачатку яго мемуарна-біяграфічны твор выразна інтравертны: аўтар распавядае пра дзіцячыя гады, першыя ўражанні, пра вучнёўства, сяброў і настаўнікаў. Пачынаючы з трэцяй часткі “Універсітэцкія часы” мемуары набываюць больш экстравертны характар, становяцца аб’ектна арыентаванымі. Бясспрэчна, гэтыя наратыўныя стратэгіі ў мемуарах узаемадзейнічаюць. Найчасцей А.Э. Адынца цікавіць “іншыя”, але ягонымі, аўтарскімі, вачыма, выбітныя асобы сяброў-філаматаў, паэтаў або проста яркія цікавыя постаці, але ў адносінах з ім, аўтарам. Мемуарыст актыўна дэманструе сваю асаблівую ролю ў прыгаданых падзеях, ахвотна дзеліцца ўласнымі ўражаннямі, падкрэсліваючы іх суб’ектыўнасць і асабасны характар. Варта заўважыць, што аўтар асвятляе постаці і падзеі, нават самыя неадназначныя, заўсёды пазітыўна, з нязменнай сімпатыяй, што найперш тлумачыцца лёгкім і неканфліктным характарам самога А. Э. Адынца, які з дзяцінства меў мянушку Beniaminek (Пястунчык, Любімчык). У апісанні гэтых “іншых” пісьменнік таксама не прытрымліваецца лінейнасці і паслядоўнасці аповеду, даючы свабоду ўласным пачуццям: “Сумная справа і не лагічная, прачытаць спачатку эпітафію, а потым распавядаць пра першае знаёмства”, – так аўтар нібыта выбачаецца за пэўную хаатычнасць успамінаў пра першае гасцяванне ў доме В. Путкамера [1, с. 249].

Момантам свайго выезду з Вільні ў Варшаву пісьменнік спыняе плынь апавяданняў пра часы філамацкай маладосці і заканчвае мемуары серыяй імянных раздзелаў, паўнавартасных нарысаў, у якіх створаны разгорнутыя літаратурныя партрэты новых знаёмых па Варшаве – К. Брадзінскага, С. Вітвіцкага, С. Гарчынскага, Ю. Б. Залескага, В. Поля. “Не буду, сястрычка, пераказваць біяграфіі маіх прыяцеляў, а толькі мае асабістыя ўспаміны”, – сцвярджае аўтар, але з яго падрабязных і характарыстычных замалёвак жыва паўстаюць постаці гэтых выбітных літаратараў [1, с. 360].

Варта адзначыць і эклектычнасць твора, насычанасць мемуарнага тэксту вялікай колькасцю ўласных паэтычных твораў А.Э. Адынца – прынагодных, вершаў-пасланняў, вершаў-прысвячэнняў, эпітафій. Літаратурны характар мемуараў узмацняюць шматлікія спасылкі і цытаты з твораў сяброў-філаматаў, а таксама з Байрана, Шылера, Гётэ. Вялікае месца займае і эпісталярны матэрыял, разгорнутыя змястоўныя фрагменты ліставання з І. Дамейкам, А. Міцкевічам, В. Полем і іншымі літаратарамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Такім чынам, А. Э. Адынец ужывае розныя наратыўныя стратэгіі і прыёмы, яго мемуары маюць цікавасць з пункту гледжання шматузроўневай кампазіцыі, самапрэзентацыі аўтарскага "эга", спантаннай, эсэістычнай манеры аповеду. Падобныя наратыўныя прыёмы былі шмат у чым наватарскімі для тагачаснай прозы, але, як слушна адзначаў Л. Я. Гаранін, памежны характар жанру, знаходжанне мемуараў на перыферыі мастацкай прозы давалі прастору для мастацкіх эксперыментаў: "У галіне зместу і ў галіне формы яно адкрывае шырокія магчымасці для наватарскіх увасабленняў" [2, с. 51].

**Літаратура**


1. Odyniec, A. E. Wspomnienia z przeszłości : opowiadane Deotymie / A. E. Odyniec. – Warszawa : Skład główny u Gebethnera i Wolffa, 1884. – 463 s.
2. Гаранин, Л. Я. Мемуарный жанр советской литературы : историко- теорет. очерк / Л. Я. Гаранин. – Минск : Наука и техника, 1986. – 223 с.


...ый архив библиотеки МГУ имени А.А.